**АДС настаўніка беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі УА “Баравухская дзяржаўная агульнаадукацыйная сярэдняя школа №15 г.Наваполацка” Румянцавай Святланы Леанідаўны**

Я, Румянцава Святлана Леанідаўна, нарадзілася 6 сакавіка 1971 года ў сям’і служачых у вёсцы Краснаполле Расонскага раёна Віцебскай вобласці.

У 1993 годзе закончыла Віцебскі дзяржаўны інстытут імя С.М.Кірава. З 1993 года выкладаю беларускую мову і літаратуру ва УА “Баравухская дзяржаўная агульнаадукацыйная сярэдняя школа №15 г.Наваполацка”.

Мая бабуля – Валянціна Іванаўна Амосенка – марыла стаць настаўніцай, валодала паэтычнымі здольнасцямі, пісала вершы, друкавалася ў раённай газеце “Голас Расоншчыны” і ў “Віцебскім рабочым”. З болем у сэрцы скардзілася яна на тое, што не змагла атрымаць добрую адукацыю. Толькі чатыры зімы пашчасціла ёй наведваць школу, а потым ранняе сіроцтва і жыццё ў мнагадзетнай сям’і пазбавіла яе надзеі на працяг вучобы. Каб бабуля змагла вывучыцца, яна, безумоўна, стала б выдатнай настаўніцай.

Нерэалізаваныя бабуліны памкненні да ведаў, да адукацыі ажыццявіліся праз яе дачку Лідзію Раманенка (маю матулю), якая прысвяціла сваё жыццё навучанню дзяцей, выкладаючы ў Краснапольскай школе матэматыку, а таксама праз унучак Алену, Святлану, Таісію. Усе мы настаўніцы. Алена Гайдукова – хімік-біёлаг, Таісія Чыкунова – географ-біёлаг. Я абрала спецыяльнасць настаўніка беларускай мовы і літаратуры.

З маленства любімым заняткам для мяне было чытанне, таму сваю будучую прафесію звязвала менавіта са Словам, без якога не ўяўляла свайго жыцця. Для мяне прадмет, які я выкладаю, – самы разнастайны з усіх школьных дысцыплінаў. Кажучы словамі Я. Ільіна, “гэта і “кухня”, дзе заўсёды цёпла і ўтульна, і “пакой”, у якім кожнаму знойдзецца добрае месца, і “палац”, куды ўрачыста ідзеш сам і клічаш з сабою, і “храм””…

Люблю школу, бо яна падобная на само жыццё. У школе штодня нешта адбываецца і выпадае магчымасць нешта змяніць, перайначыць, пакінуўшы ў нечым лёсе не толькі добрую ці выдатную адзнаку, але і часцінку сваёй душы.

***Фотаздымак. Візітка***

***Актуальнасць праектавання АДС***

Развіццё агульнай сярэдняй адукацыі ў краіне ажыццяўляецца шляхам агульнасістэмных пераўтварэнняў:

- пераходу на новую структуру школы,
- увядзення новага вучэбнага плана, новых праграм і падручнікаў,
- правядзення цэнтралізаванага тэсціравання і інш.

Не менш значнымі з’яўляюцца лакальныя педагагічныя інавацыі, якія ажыццяўляюцца на ўзроўні школ. Лічу, што многія супярэчнасці сучаснай адукацыі і соцыума ў цэлым могуць быць вырашаны шляхам прафесійнага

самаразвіцця настаўнікаў, пераасэнсавання ўласнага вопыту, выяўлення ў ім станоўчага, а таксама таго, ад чаго варта было б адмовіцца.

Жаданне атрымліваць задавальненне ад работы і навучыць дзяцей вучыцца з карысцю прымусіла мяне шукаць адказы на пытанні аб тым, чаму і як трэба вучыць.

Гэтыя пошукі сталі штуршком для стварэння аўтарскай дыдактычнай сістэмы.

***Стварэнне АДС дазволіць мне:***

– структураваць і аформіць свой вопыт работы;

– аб'яднаць разрозненыя паспяховыя методыкі ў цэласную стройную сістэму;

– ацаніць па значымых крытэрыях і сістэматызаваць сваю педагагічную практыку;

– быць канкурэнтаздольнай;

– павысіць эфектыўнасць работы, зрабіўшы пэўныя крокі да прафесійнага самаразвіцця і ўдасканалення.

***Змест маёй місіі*** зыходзіць з асноўнага прыярытэту развіцця сучаснай адукацыі, патрабаванняў дзяржавы, запатрабаванняў вучняў, іх бацькоў, зместу місіі школы, маёй асабістай грамадзянскай пазіцыі.

***Місія школы:*** сёння старанны і працалюбівы вучань, а заўтра – паспяховы і шчаслівы чалавек.

***Мая педагагічная місія*** заключаецца ў тым, каб ствараць умовы для развіцця і выхавання творчай, сацыяльна актыўнай і паспяховай асобы.

***Мой прафесійны дэвіз:*** адукацыя праз усё жыццё.

***Жыццёвае крэда:*** дарогу адолее той, хто ідзе.

***Формула поспеху:*** Якасць адукацыі = $\frac{\text{мэта}}{\text{вынік}}$ .

***Кампанентамі АДС з'яўляюцца:***

– мэты і задачы;
– змест адукацыі;
– дзейнасць вучняў;
– дзейнасць настаўніка;
– формы, метады, сродкі навучання;
– вынік вучэбнага працэсу.

**Псіхолага-педагагічныя ідэі і тэорыі, на якіх будуецца АДС:**

– ідэя прыродаадпаведнасці;
– тэорыя паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў;
– тэорыя праблемнага навучання;
– асобасна-дзейсны падыход.

***Педагагічныя прынцыпы АДС***

***Прынцыпы класічнай дыдактыкі:*** навуковасці, даступнасці, актыўнасці, сістэмнасці, паслядоўнасці, нагляднасці, сувязі з жыццём.

***Сучасныя адукацыйныя прынцыпы:*** прынцыпы развіцця, узгаднення мэтаў, рэфлексіі, камп'ютэрызацыі.

***Віды мэтаў і задач:***

– **навучальныя (практычныя, кагнітыўныя) мэты на ўрок ці тэму** фармулююцца праз дзеянні вучняў, якімі яны авалодаюць да канца ўрока, або з дапамогай тэсту, праверачнага задання.

– **задачы асобаснага развіцця** фармулююцца з дапамогай слоў і словазлучэнняў “садзейнічаць”, “спрыяць”, “стварыць умовы”, “арганізаваць сітуацыю”, “падтрымліваць”…

– **задачы захавання здароўя** рэалізуюцца праз характарыстыкі здароўезберагальнага асяроддзя ўрока.

***Змест адукацыі:*** веды і ўменні ў аб’ёме праграмы па беларускай мове і літаратуры; вучэбныя, сацыяльныя, гуманістычныя кампетэнцыі; вучань з яго здольнасцямі, жыццёвым вопытам, асаблівасцямі асобаснага развіцця.

**Дзейнасць настаўніка**

– Планаванне ўрокаў (выяўляю гатоўнасць вучняў да вывучэння новага матэрыялу, прадумваю магчымасці вучэбнага матэрыялу для асобаснага развіцця вучняў, прыдумваю адкрытыя заданні і пытанні, планую развіццёвыя адукацыйныя сітуацыі).

– Стварэнне умоў для асобаснага развіцця вучняў, фарміравання вучэбных кампетэнцый (арганізую самавызначэнне вучняў на свой асабісты вынік і характар адукацыйных прадуктаў і дэманструю вялікае спадзяванне на дзяцей; абапіраюся на суб’ектны вопыт вучняў; арганізую адукацыйныя сітуацыі, якія ствараюць перадумовы для асобаснага развіцця вучняў і ў якіх вучні авалодваюць вучэбным матэрыялам; арганізую самакантроль, самааналіз, самаацэнку дзейнасці).

– Павышэнне прафесійнага ўзроўню настаўніка (аналізую адукацыйныя сітуацыі, якія былі на ўроку; вызначаю напрамкі і меры па развіцці ўласнай прафесійнай дзейнасці; працую над удасканаленнем сістэмы ўрокаў).

**Дзейнасць вучняў**

– Ацэньваюць свае веды як няпоўныя; самавызначаюцца на працэс і вынік, плануюць сваю работу.
– Рэалізуюць свае планы, “пражываюць” створаныя настаўнікам развіццёвыя адукацыйныя сітуацыі, асэнсоўваюць матэрыял, ствараюць асабістыя адукацыйныя прадукты.
– Асэнсоўваюць сваю дзейнасць і яе вынік, выяўляюць удалыя і няўдалыя метады, прыёмы работы, карэкціруюць свае ўяўленні і ўменні, выконваюць творчыя і адкрытыя заданні.

***Прафесійная пазіцыя***

Чалавек – гэта цэлы свет.

Кузьма Чорны

Не бойцеся расці павольна, бойцеся заставацца нязменнымі.

Кітайская прымаўка

Пільная ўвага да іншага чалавека, павага да яго, патрабавальнасць да сябе, пастаянны духоўны пошук, шчырасць у выражэнні пачуццяў – вось тая аснова, на якой стараюся будаваць адносіны са сваімі вучнямі.

Імкнуся засцерагчы ад чэрствасці, абыякавасці, запаліць у дзіцячых сэрцах агеньчык творчасці, дабрыні, любові да мовы, маці і Айчыны.

***Выкарыстоўваю элементы асобасна арыентаваных тэхналогій:*** тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо, развіццёвай, модульнай, камп'ютэрна-інфармацыйнай.

***Формы арганізацыі адукацыйнага працэсу, якія я прымяняю:*** урокі, факультатыўныя заняткі, прадметныя тыдні, конкурсы, алімпіяды.

***Прымяняю наступныя метады:*** практычныя, наглядныя, славесныя, эўрыстычныя, праблемнага навучання, стымулявання і матывацыі дзейнасці.

***Сродкі навучання, якія мной шырока прымяняюцца:***

– традыцыйныя (ілюстрацыйны матэрыял, падручнікі, слоўнікі, зборнікі дыдактычных матэрыялаў…);

– уласныя ( алгарытмы, карткі-заданні, кластэры, тэсты…);

– матэрыялы, якія распрацоўваюцца вучнямі (ілюстрацыі, карткі, крыжаванкі…)

– мультымедыйныя сродкі, камп'ютэрныя прэзентацыі.

***Пры адборы сродкаў навучання кіруюся наступнымі прынцыпамі:*** адпаведнасці санітарна-гігіенічным патрабаванням, сумяшчальнасці, функцыянальнасці.

***У якасці выніку вучэбнага працэсу разглядаю:***

– веды, уменні і навыкі, якія атрымалі вучні на занятках;

– асабістае інтэлектуальнае і маральнае развіццё вучняў, вучэбныя і сацыяльныя кампетэнцыі, якімі авалодалі школьнікі.

***Прымяняю наступныя спосабы ацэнкі вучэбнага працэсу:***

– бягучы і тэматычны кантроль;

– тэсты вучэбных дасягненняў;

– параўнанне дасягненняў вучня з яго пачатковым узроўнем абучанасці;

– выкананне творчых работ;

– рэфлексія.

***Апрабацыя АДС:*** адкрытыя ўрокі; выступленні на школьных і гарадскіх МА; удзел у навукова-практычных канферэнцыях; удзел у абласных семінарах і метадычных саветах; удзел у разнастайных конкурсах; публікацыі.

***Сведчанне эфектыўнасці АДС. Прафесійныя дасягненні настаўніка і яго вучняў:***

– вучні паспяхова здаюць экзамены па беларускай мове за курс базавай і сярэдняй школы; у мяне складваюцца добрыя адносіны з дзецьмі, якія не перарываюцца пасля заканчэння імі школы;

– вучні ўдзельнічаюць і дасягаюць поспехаў у разнастайных конкурсах, канферэнцыях, алімпіядах;

– у 2008 – 2009, 2009-2010 навучальных гадах сумесна з калегамі з іншых школ горада прымала ўдзел у рабоце гарадской школы "Шлях да Алімпу";

– за эфектыўны ўдзел у гарадской навукова-практычнай канферэнцыі "Вучэбна-метадычнае забеспячэнне развіцця здольнасцей

школьнікаў у працэсе рашэння разнастайных вучэбных задач” (2000 г.) была ўзнагароджана дыпломам II ступені;

– з’явіліся публікацыі ў навукова-метадычных часопісах “Народная асвета”, “Беларуская мова і літаратура”;

– у гарадскім конкурсе метадычных распрацовак з выкарыстаннем ІТ (2009 г.) план-канспект урока атрымаў дыплом II ступені, сцэнар пазакласнага мерапрыемства – дыплом I ступені;

– стала лаўрэатам гарадскога конкурсу “Настаўнік года 2009”;

– у гарадскім конкурсе кабінетаў беларускай мовы і літаратуры – III месца (2009 г.);

– у гарадскім конкурсе МА беларускай мовы і літаратуры (2009 г.) школьнае МА, кіраўніком якога я з’яўлялася, выйшла ў фінал і стала прызёрам у намінацыі “Пазакласная работа”;

– кіраўнік гарадскога МА настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры;

– праца адзначана падзякамі, граматамі.

***Накірункі далейшых метадычных пошукаў.*** Накоплены пэўны вопыт работы. АДС апісана і прадстаўлена ў форме прэзентацыі, апрабацыя прайшла ў настаўніцкіх аўдыторыях, з сістэмай працы знаёміліся і крытычна ацэньвалі мае калегі. Аднак самазаспакойвацца рана. Не заўсёды ўсё атрымліваецца так, як плануеш, не ўсё ўдаецца. Адчуваю недахоп часу, каб рэалізаваць многія свае памкненні, задумы. Але самае галоўнае тое, што ёсць патрэба рухацца ўперад, нешта мяняць у сваёй дзейнасці, самаўдасканальвацца. Цвёрда пераканана: дарогу адолее той, хто ідзе.

Электронная версія АДС прызначаецца для мультымедыйнай прэзентацыі. Акрамя гэтага слайды раздрукаваны на паперы і выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу. Гэтая версія ўтрымлівае дадатак, які змяшчае лепшыя распрацоўкі ўрокаў, пазакласных мерапрыемстваў, выступленні, даклады, апісанне вопыту работы.

Вялікую дапамогу пры стварэнні АДС аказала кніга М. І. Запрудскага “Моделирование и проектирование авторских дидактических систем”. Вялікі дзякуй яе аўтару і ўсім тым, хто прымаў удзел у яе з’яўленні!

## Выкарыстаная літаратура

1. Запрудский, Н. И. Моделирование и проектирование авторских дидактических систем / Н. И. Запрудский. – Минск, – 2008. – 336 с.